**Латушкін Андрэй Мікалаевіч**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (Мінск, Беларусь)*

# МЕСЦА АРХІЎНАЙ СПАДЧЫНЫ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА Ў ПРАЦЭСАХ ДЗЯРЖАЎНАГА БУДАЎНІЦТВА Ў БЕЛАРУСІ Ў ХХ СТ.

У 2017 г. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка ў выступленні прысвечаным Дню Незалежнасці Беларусі, выразна падкрэсліў факт старажытнасці беларускай дзяржаўнасці, адносячы яе вытокі да IX ст., Вялікае Княства Літоўскае, выдатныя дасягненні яго дзеячоў, такія як кнігадрукаванне, статуты ВКЛ на старабеларускай мове, названыя ім неад’емнай часткай шляху беларускага народа ў яго спрадвечным імкненні да незалежнасці [1]. У даным артыкуле аўтар хацеў бы засяродзіцца толькі на невялікім, але істотным у праблематыцы гісторыі Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага (далей — ВКЛ) аспекце — тэме архіва ВКЛ як дзяржавы, яго лёсу і месца ў палітыцы нацыянальнага дзяржаўнага будаўніцтва пазнейшых утварэнняў — БНР, БССР і Рэспублікі Беларусь. Дадзенае пытанне мае значэнне ў першую чаргу з пункту гледжання прыроды такой з’явы як сама дзяржаўнасць. Найважнейшым атрыбутам любой дзяржавы, сведчаннем яе незалежнасці, з’яўляецца дзяржаўны архіў. Ён фарміруецца пры кіраўніку дзяржавы або пры вышэйшым органе ўлады і канцэнтруе ў сабе найважнейшыя прававыя акты, якія падцвярджаюць правасуб’ектнасць (самастойнасць) на міжнароднай арэне і замацоўваюць раўнапраўнае месца сярод іншых краін (дамовы ўзроўню «дзяржава — дзяржава»), утрымліваюць нормы, якія ляжаць у аснове канстытуцыйнага ладу (дамовы ўзроўню «дзяржава — грамадзяне»), рэгулююць сацыяльныя прававадносіны (ўзровень «грамадзянін — грамадзянін»). Пазбаўленне таго або іншага дзяржаўнага ўтварэння яго архіва выступае актам аднаго парадку з пазбаўленнем той або іншай дзяржавы яе незалежнасці. Працэс вяртання дзяржаўнага архіва (у любой форме) — прыкмета аднаўлення страчанай дзяржаўнасці.

Аснову дзяржаўнага архіва ВКЛ («архіва ВКЛ») складаў комплекс арыгіналаў найважнейшых прававых актаў агульнадзяржаўнага значэння, месцам захоўвання якіх першапачаткова выступаў «земскі скарб». Ён уключаў некалькі груп дакументаў, сярод якіх найбольш буйнымі былі: 1) агульназемскія прывілеі ВКЛ; 2) міравыя пагадненні паміж ВКЛ і вялікімі князямі маскоўскімі, гаспадарамі малдаўскімі і іншыя дамовы знешнепалітычнага характару; 3) акты ўній ВКЛ і Каралеўства Польскага; 4) дакументы аб зносінах вялікіх князёў літоўскіх з Ватыканам [2]. Адначасова існаваў архіў вялікай і малой канцылярый ВКЛ, які ўтвараў т. зв. Метрыку ВКЛ. Абодва масівы ў навуцы трактуюцца як самастойныя, тэрмін «дзяржаўны архіў ВКЛ», «архіў ВКЛ» як уласна арыгіналы актаў на Метрыку ВКЛ спецыялістамі не распаўсюджваецца (Э. Д. Банёніс, А. Я. Рыбакоў, А. І. Груша) [3, с. 74, 75—76]. Аднак, можна сцвярджаць, што ў канцы XVIII ст. напярэдадні падзелаў Рэчы Паспалітай, комплекс арыгіналаў дзяржаўна-прававых актаў і Метрыка ВКЛ уяўлялі сабой дзве галоўныя складаючыя часткі архіва дзяржавы. Пасля паўстання 1794 г., згодна з пунктам 5 указу імператрыцы Кацярыны II, выдадзенага А. В. Суво-

раву 21 лістапада (2 снежня) 1794 г. былі канфіскаваныя і вывезеныя з Варшавы ў Расію архівы Каралеўства Польскага: 1) т. зв. Каронная Метрыка — аналаг Метрыкі ВКЛ; 2) Архіў скарбца Каралеўства Польскага («Кароннага») — аналаг комплекса арыгіналаў актаў архіва ВКЛ. Той жа загад распаўсюджваўся і на Метрыку ВКЛ [4, с. 92]. Асноўная яе маса к канцу XVIII ст. таксама была сканцэнтравана ў Варшаве. Частка кніг, верагодна, захоўвалася ў Вільні (касцёл Св. Казіміра) [5, с. 56]. У студзені 1795 г. архівы «Рэчы Паспалітай абодвух народаў» ужо знаходзілася Санкт-Пецярбурзе (архіў Сенату). Аднак на тэрыторыі краіны засталася частка комплекса арыгіналаў дзяржаўна-прававых актаў архіва ВКЛ — найбольш старажытныя і каштоўныя акты за канец XIV-1-ю пал. XVII стст., якія адлюстроўвалі пераважна «далюблінскі» перыяд у гісторыі Беларусі. Даны комплекс захоўваўся ў складзе прыватных архіваў роду князёў Радзівілаў, ардынатаў нясвіжскіх. Да іх дакументы патрапілі ў другой палове XVII ст., верагодна, праз прадстаўнікоў лініі на Біржах і Дубінках — ваяводу віленскага, вялікага гетмана ВКЛ Януша (1612—1655) і канюшага ВКЛ Багуслава (1620—1669) Радзівілаў. Пасля смерці князя Багуслава Радзівіла яны патрапілі ў валоданне нясвіжскай галіны роду (не пазней 1685 г.). Канстытуцыя сейма Рэчы Паспалітай 1768 г. узаконьвала такі стан рэчаў шляхам падцверджання прывілея Жыгімонта II Аўгуста ад 3 лістапада 1551 г. на ганаровае права захоўвання Радзівіламі нясвіжскай галіны агульназемскіх прывілеяў ВКЛ, хоць, як стала вядома пазней, прывілей 1551 г. з'яўляўся фальсіфікатам [6]. На 1790 г. комплекс знаходзіўся ў Нясвіжскім замку, пазней быў перамешчаны дзеячамі роду ў Няборaў, рэзідэнцыю ваяводы віленскага Міхала Гераніма Радзівіла (1744—1831). Там дакументы зберагаліся на працягу ўсяго наступнага стагоддзя і вернутыя ў Нясвіжскі замак былі толькі ў пач. XX ст. У жніўні 1915 г. комплекс арыгіналаў дзяржаўна-прававых актаў архіва ВКЛ быў эвакуяваны з Нясвіжа, а не пазней 1920 гг. перамешчаны Радзівіламі ў Варшаву.

Адметна тое, што гэта ўнікальнае сведчанне былой дзяржаўнасці ВКЛ, яе сімвал Радзівілы не перадалі тады аднаўленай Польшчы. Тая ж, у сваю чаргу, фактычна заявіла аб правапераемнасці з Рэччу Паспалітай, прэтэндавала на архіўную спадчыну былых Каралеўства Польскага і ВКЛ, дабілася згодна з Рыжскай мірнай дамовай 1921 г. маштабнага вяртання архіваў з тэрыторыі Расіі, прад'яўляла прэтэнзіі на Метрыку ВКЛ (беспаспяхова). Дзяржаватворчыя працэсы ў Літве, як нагода перадачы архіва, князямі таксама былі праігнараваныя. Радзівілы прадаўжалі захоўваць яго ў прыватных руках. Уключэнне збора ў склад Галоўнага архіва старажытных актаў Польшчы (Archiwum Główny Akt Dawnych, далей — ГАСА) адбылося толькі ў 1946 г., фактычна шляхам яго нацыяналізацыі. У гэтай сувязі прынцыпова важным падаецца стаўленне да названага архіва беларускіх дзяржаўных утварэнняў, якія ўзніклі на нашай тэрыторыі ў выніку падзей 1917 г. Існуе пэўная спецыфіка разгляду гэтага пытання ў межах савецкага перыяду. У сувязі з дастаткова позняй распрацоўкай праблемы ў гістарыяграфіі (1902—1932 гг., Польшча) і акрэсліваннем яе ў беларускай гістарычнай навуцы фактычна толькі ў 1990-я гг., праблему ў названы час мэтазгодна разглядаць комплексна — у кантэксце мерапрыемстваў па вяртанні Метрыкі ВКЛ [6].

Вядома, што заклікі аб вяртанні ў Беларусь архіваў, вывезеных у Расію падчас Першай Сусветнай вайны рабіліся ад імя беларусаў-вайскоўцаў

Заходняга фронту і Ўрада Беларускай Народнай Рэспублікі (далей — БНР). Аднак гэтыя спробы прызнаныя беспаспяховымі. Існуюць звесткі, якія дазваляюць сцвярджаць, што ў 1920 г. ўрад БНР прадпрымаў меры супрацьдзеяння планам Літвы дабіцца ад РСФСР перадачы Метрыкі ВКЛ у Коўню [7, с. 4].

У савецкі перыяд вырашальны ўплыў на разглядаемае пытанне мелі фатычнае падпарадкаванне БССР цэнтральным партыйным і дзяржаўным органам РСФСР, пазней — СССР, адсутнасць самастойнасці ў знешнепалітычнай дзейнасці. Тым не менш, і дадзенае становішча дазваляла кіраўніцтву краіны ўзнімаць акрэсленыя пытанні ў межах рэалізацыі палітыкі нацыянальнага дзяржаўнага будаўніцтва, а са стварэннем СССР — выкарыстаць магчымасць іх вырашэння ў межах цэнтралізаванай архіўнай галіны СССР і мер па выдзяленні няпрофільных фондаў, пераразмеркаванні дакументаў паміж саюзнымі рэспублікамі [8, с. 150].

Вядучую ролю ў працэсах вяртання архіваў у БССР у 1920-я гг. адыграў Беларускі дзяржаўны універсітэт. Гістарычнае права Беларусі на адну з важнейшых частак архіўнай спадчыны ВКЛ як дзяржавы — Метрыку ВКЛ — даказваў першы рэктар БДУ У. І. Пічэта (1878—1947). Ён называў яе найвялікшым помнікам беларускай мовы і культуры [9, с. 647—648]. Пазіцыя абароны Метрыкі ВКЛ ад перадачы Польшчы або Літве была прадэманстравана ім у 1920—1921 гг. і 1923—1924 гг. як экспертам савецкага боку пры выпрацоўцы і рэалізацыі палажэнняў Маскоўскай дамовы аб міры паміж РСФСР і Літвой ад 12 ліпеня 1920 г. (артыкул IX) і Рыжскай мірнай дамовы 18 сакавіка 1921 г. (артыкул XI) [10, с. 49, 62—63, 67, 70—73, 75, 76; 14, 69—76]. Дзейнасць вучонага па абароне інтарэсаў Беларусі адносна Метрыкі ВКЛ на міжнародным узроўні была прадоўжана і пазней [10, с. 139; 4, с. 96]. Яна высока ацэньвалася ў БССР: адным з важнейшых форумаў прадстаўнікоў архіўнай галіны 1924 г. У. І. Пічэце была выказана падзяка «за адстаіваньне беларускіх архіваў» [цыт. па: 11, с. 23].

Разам з У. І. Пічэтам у 1920-я гг. увасабленнем ідэі вывучэння помнікаў беларускага права і вяртання Метрыкі ВКЛ былі і знакамітыя вучоныя — доктар гістарычных навук, прафесар БДУ М. В. Доўнар-Запольскі (1867—1934); дацэнты Дз. І. Даўгяла (1868—1942), В. Д. Дружчыц (1886—1937) і інш. Выключна важнае значэнне для вырашэння праблемы вяртання ў БССР Метрыкі ВКЛ з РСФСР, абароны яе ад прэтэнзій іншых дзяржаў, мелі 1-я Усебеларуская канферэнцыя архіўных работнікаў 12—15 мая 1924 г., Першы з’езд даследчыкаў беларускай археалогіі і археаграфіі 17—18 студзеня 1926 г. Названыя мерапрыемствы атрымалі падтрымку вышэйшага кіраўніцтва рэспублікі [5; 12]. Ганаровымі старшынямі з’езду 1926 г. з’ўляліся: старшыня ЦВК БССР А. Р. Чарвякоў, старшыня СНК БССР Я. А. Адамовіч, 1-ы сакратар ЦК КП(б)Б А. І. Крыніцкі і інш. Намеснік народнага камісара асветы А. В. Баліцкі у вітальным слове адзначаў: «Адным з цікавейшых помнікаў з’яўляецца Літоўская Мэтрыка, якая знаходзіцца ў Маскве. Польшча дамагаецца ад СССР, каб гэты наш помнік забраць да сябе. Мы павінны заявіць тут, што гэты помнік старасьветчыны — наш, і *толькі Беларуская Савецкая ўлада* мае на яго права» (выдзелена — *А. Л.*) [5, с. 8]. Рэзалюцыі абодвух форумаў патрабавалі вяртання архіваў, вывезеных з Беларусі ў дарэвалюцыйны час і ў часы акупацый, і былі скіраваныя супраць выдачы «архіваў

Літоўскай метрыкі» Польшчы, Літве або іншым дзяржавам*. Рэзалюцыя № 1 з'езду 1926 г. патрабавала «як найхутчэй перавезьці архіўны фонд Метрыкі Літоўскай у БССР» [5, с. 5—6].

Намаганні айчыннай навуковай эліты, а таксама вышэйшага дзяржаўнага кіраўніцтва садзейнічалі прыняццю пастановы Прэзідыума ЦВК СССР аб задавальненні хадайніцтваў ЦВК Беларускай ССР і Украінскай ССР аб вяртанні архіваў з РСФСР і стварэнні адпаведнай сумеснай камісіі з прадстаўнікоў зацікаўленых бакоў (18 верасня 1925 г.). Пазіцыя БССР адносна прэтэнзій на дакументы перыяду ВКЛ фармулявалася ў межах дзейнасці камісіі наступным чынам: прад'яўляць прэтэнзіі на «усе дакументы Вялікага княства Беларуска-Літоўскага, якія ня маюць адносін да УССР» [11, с. 81—82; 13, с. 570—571]. У складзеных камісіяй БССР спісах матэрыялаў айчыннага паходжання ў РСФСР, акрамя Метрыкі ВКЛ заяўлены і акты (арыгіналы і копіі), якія мелі адносіны да комплекса арыгіналаў актаў дзяржаўнага архіва ВКЛ**.

На першапачатковым этапе дзейнасці камісіі (лістапад 1925 г.) праблема перадачы Метрыкі ВКЛ БССР знаходзіла паразуменне. Працэс стрымлівала адсутнасць канчатковага рашэння аб перадачы гэтага фонда Польшчы. У далейшым пытанне сустрэла вострую апазіцыю з боку дзеячоў Цэнтрархіва РСФСР і расійскіх вучоных. У якасці контраргумента адносна выдачы саюзным рэспублікам каштоўных гістарычных актаў са складу рукапісных фондаў устаноў Масквы і Ленінграда выступала ідэя забароны на парушэнне цэласнасці фондаў і калекцый. Цалкам спыніла названыя працэсы стварэнне ў 1929 г. саюзнага органа па кіраванню архіўнай справай і распрацоўка норм аб канцэнтраванні ў саюзным цэнтры архіўных матэрыялаў «агульнасаюзнага значэння» [14, с. 95—113].

Павышэнне актыўнасці ў пытаннях рэстытуцыі беларускіх архіваў адбылося ў канцы 1939 г. Яно звязана з увядзеннем савецкіх войск у Заходнюю Беларусь і працэсам аб'яднання БССР. Падзеі, якія ў сувязі з гэтым адбыліся ў сферы архіваў краіны, дэманструюць выразнае прыхільнае стаўленне тагачаснага кіраўніцтва рэспублікі да пытанняў вяртання з Польшчы і Літвы на Беларусь архіўных матэрыялаў, створаных на яе тэрыторыі. Яны былі спробай

---

* «Заслухаўшы даклад праф. У. І. Пічэты аб уплыву дагавораў РСФСР з утварыўшыміся дзяржавамі на стан беларускіх архіваў і прымаючы пад увагу вялікую значнасьць Літоўскай метрыкі *як асноўнага грунтоўнага гістарычнага матэрыялу, застаўшагася ад мінулых часоў Беларускай дзяржавы*, *без якога не магчымы навуковыя высьляды мінулага Беларусі* (выдзелена — *А. Л.*), а гэтак сама значнасьць другіх беларускіх каштоўных архіўных матэрыялаў, на якія пратандавалі і пратандуюць занава ўтварыўшыяся дзяржавы, нарада архіўных працаўнікоў БССР знаходзіць патрэбным даручыць Цэнтрархіву БССР зьвярнуцца ў ЦВК СССР аб недапушчэньні вывазу беларускіх архіўных матэрыялаў з тэрыторыі СССР у Польшчу, Латвію, Літву і др. дзяржавы і прыняць меры аб звароце на Беларусь архіўных матэрыялаў, якія былі вывезены з Беларусі ў дарэвалюцыйны час і ў часы розных акупацый» [12, с. 52, 54].

** «Грамоты удельных князей Литовских» — былы архіў Міністэрства замежных спраў, фонд т. зв. «Древлехранилища» («государственное древлехранилище хартий, рукописей и печатей», створана ў Маскве ў 1851 г. як аддзел «Збройнай палаты», з 1882 г. у складзе Маскоўскага Галоўнага архіва Міністэрства замежных спраў, у цяперашні час — РДАСА); «3. Грамоты Вел(икого) Кн(яжества) Литовского, переданные при перевозке Литовской Метрики из Сената в Московский архив М(инистерства) Юст(иции)» [11, с. 91]; Дзяржаўная Публічная бібліятэка ў г. Ленінградзе, аддзел рукапісаў: зборнік з копіямі агульназемскіх прывілеяў ВКЛ і іншых дзяржаўна-прававых актаў за перыяд 1413 г. — не пазней 1587 г., створаны ў перыяд кіравання Стэфана Баторыя як афіцыйна завераная копія актаў названага віду; акты (пераважна — копіі) з архіва Нясвіжскай ардынацыіі Радзівілаў [5, с. 31—32, 34—35; 2, с. 252—263].

праяўлення самастойнасці ў вырашэнні даных пытанняў. Так, у 1940 г., пасля перадачы Акадэміі Навук БССР дакументаў Архіва Нясвіжскай ардынацыі Радзівілаў, яе кіраўніцтвам быў ініцыяваны працэс прад'яўлення прэтэнзій ураду Пальшчы на частку архіва, вывезеную Радзівіламі з Нясвіжа ў Варшаву ў перыяд 1919—1939 гг. 2 сакавіка 1940 г. віцэ-прэзідэнт Акадэміі навук БССР С. М. Ліпатаў звяртаўся ў Цэнтральны Камітэт КП(б)Б і Савет Народных Камісараў БССР з просьбай аб прыняцці адпаведных мер. Важна тое, што менавіта гэта частка ўтрымлівала дакументы дзяржаўнага архіва ВКЛ*. Далейшы ход справы па ўзнаўленні савецкім бокам цэласнасці Нясвіжскага архіва, а значыць і гіпатэтычным вяртанні дакументаў дзяржаўнага архіва ВКЛ, прыпыніла Вялікая Айчынная вайна. Апісаная вышэй падзея была не адзінай з шэрагу тых, якія адбыліся ў 1939—1941 гг. і адносіліся да справы архіваў былога ВКЛ на Беларусь [16]. Даныя факты сведчаць, што архівы беларускага паходжання, у тым ліку дакументальная спадчына ВКЛ, разглядалася тагачасным савецкім кіраўніцтвам БССР як набытак беларускага народа.

У пасляваенны час найбольш актуальнай задачай галіновых дзяржаўных органаў краіны выступала аднаўленне цэласнасці архіўнага фонда БССР, які панёс непамерныя страты падчас Вялікай Айчыннай вайны, пошук і вяртанне вывезеных акупантамі дакументаў, наладжванне працы архіваў і ўдасканаленне самой сеткі дзяржаўных архіўных устаноў. Адначасова адным з асноўных у канцы 1940-х—пач. 1960-х гг. становіцца і пытанне вяртання дакументальнай спадчыны Беларусі перыяду ВКЛ з архіваў Расіі і саюзных рэспублік — як мера ўдакладнення фондавай прыналежнасці дакументаў архіваў саюзных рэспублік [14, с. 155—156]. Можна сцвярджаць, што архіўныя ўлады рэспублікі выразна дэманстравалі ў гэтым пазіцыю ў інтарэсах Беларусі. Так, калі ў 1948 г. узнікала пагроза перамяшчэння ў Маскву ў Цэнтральны дзяржаўны архіў старажытных актаў (ЦДАСА) *усіх* фондаў перыяду ВКЛ і Рэчы Паспалітай, кіраўніцтва архіўнай галіны рэспублікі не толькі здолела гэта перадухіліць, але актыўна выступіла за перадачу падобных матэрыялаў БССР, у тым ліку з ЦДАСА, дзе захоўвалася Метрыка ВКЛ**. Аднак гэтыя намаганні ні ў той час, ні пазней плёну не мелі. У 1960-я гг. кіраўніцтва архіўнай галіной СССР заяўляла: «... Вопрос о Литовской Метрике давно решен и в будущем к нему не следует возвращаться ни в письменном, ни в устном виде» [17, с. 33]. Канец 1950-х — пач.

* «Выходзячы з таго, што матэрыялы Нясвіжскага архіва з'яўляюцца архіўнымі дакументамі былых устаноў на тэрытрыі БССР, Літоўскай ССР, Украінскай ССР, г. зн. — СССР, і што гэтыя архіўныя матэрыялы адлюстроўваюць гісторыю беларускага, літоўскага і ўкраінскага народаў, лічым, што ўсе матэрыялы Нясвіжскага архіва, вывезеныя белапалякамі ў Варшаву, належаць і павінны быць адданы народам СССР. Таму Акадэмія навук БССР просіць Цэнтральны камітэт КП(б)Б і Савет Народных Камісараў БССР аб прыняцці адпаведных мер для звароту з Варшавы матэрыялаў Нясвіжскага архіва» [15, с. 100].

** Заключны дакумент нарады Архіўнага ўпраўлення МВД БССР ад 8 жніўня 1948 г. «Учитывая исторические особенности развития Белоруссии, в результате которых большое количество документальных материалов, относящихся к территории Белорусской ССР, оказались вне ее пределов и в настоящее время находятся в Центральном государственном архиве Литовской ССР и *Центральном государственном архиве древних актов* (выдзелена — *А. Л.*), Архивное управление МВД БССР просит Главное архивное управление дать распоряжение Центральному государственному архиву Литовской ССР и *Центральному государственному архиву древних актов* о передаче всех материалов, относящихся к территории Белоруссии, в Центральный исторический архив Белорусской ССР и его филиал, чем создать научную базу для изучения истории Белоруссии с древнейших времен» [Цыт. па: 14, с. 161].

1960-х гг. азнаменаваўся і паўторнай спробай ініцыявання вяртання з Польшчы архіва Нясвіжскай ардынацыі Радзівілаў. У 1959 г., 1960 г. кіраўніцтва архіўнай службы БССР накіроўвала інфармацыю аб ім у Галоўнае архіўнае ўпраўленне СССР, аднак безвынікова [14, с. 169, 176]. Актыўныя намаганні Галоўнага архіўнага ўпраўлення пры Савеце Міністраў БССР вярнуць у пасляваенны перыяд частку архіўнай «радзівіліяны» з Літоўскай ССР сутыкнуліся з моцным супраціўленнем літоўскіх архівістаў.

Вяртанне Метрыкі ВКЛ у Беларусь адбылося ў 1992 г. Аб завяршэнні праекта прадстаўнікамі дзяржаўнай архіўнай службы было паведамлена 28 студзеня 1992 г. на адным з паседжанняў камісіі «Вяртанне». Мікрафільмы (пазітывы) з фонда № 389 ЦДАСА былі ўключаны ў склад Цэнтральнага дзяржаўнага гістарычнага архіва Беларусі (НГАБ) у выглядзе калекцыі «КМФ-18» (663 адзінкі захоўвання). Выраб копій адбываўся за кошт беларускага боку [18; 14, с. 200, 202].

Такім чынам, узбуджэнне пытання вяртання Метрыкі ВКЛ і комплекса арыгіналаў дзяржаўна-прававых актаў дзяржаўнага архіва ВКЛ у перыяд 1917—2017 гг. суправаджала працэсы дзяржаўнага будаўніцтва ўсіх форм дзяржаўных утварэнняў — БНР, БССР і Рэспублікі Беларусь. Яго ўзняцце супадала з найбольш важнымі этапамі ў жыцці краіны, такімі як стварэнне дзяржавы, пашырэнне яе тэрыторыі (узбуйненні БССР 1924 г. і 1926 г., далучэнне Заходняй Беларусі), абвяшчэнне незалежнасці (1991 г.). Метрыка ВКЛ пазіцыянавалася ў іх як галоўны архіў цэнтральнага органа кіравання і разглядалася кіраўніцтвам рэспублікі, інтэлектуальнай элітай як важны элемент у працэсах дзяржаўнага будаўніцтва, з акцэнтам на яе крыніцазнаўчую каштоўнасць. Асноўная роля ў ініцыяванні пытання, навуковым абгрунтаванні, арганізацыйным і інфармацыйным суправаджэнні яго вырашэння належыла прафесарска-выкладчыцкаму складу і кіраўніцтву Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Найбольш істотным вынікам гэтых працэсаў стала набыццё ў 1992 г. органамі дзяржаўнай архіўнай службы Беларусі копіі Метрыкі ВКЛ ў форме т. зв. міклафільмаў. Пытанне вяртання ў той або іншай форме комплекса арыгіналаў дзяржаўна-прававых актаў у перыяд 1917—1991 гг. асобна не фармулявалася па прычыне недастатковасці інфармацыі аб гісторыі і месцазнаходжанні комплекса, яго статусе як часткі дзяржаўнага архіва ВКЛ. Аднак вялікае навуковае і гісторыка-культурнае значэнне актаў комплекса выразна прасочваецца ў кантэксце апісання каштоўнасці і абгрунтавання вяртання на Беларусь Метрыкі ВКЛ, а таксама дакументаў архіва Нясвіжскай ардынацыі князёў Радзівілаў.

За перыяд 1991—2017 гг. нягледзячы на распаўсюджванне інфармацыі і з'яўленне спецыяльных даследаванняў аб складзе архіва ВКЛ, пытанне стварэння электронных копій з асноўнай часткі комплекса арыгіналаў, што захоўваецца ў Галоўным архіве старажытных актаў у Варшаве, вырашана не было [8]. Прэтэнзіі на вяртанне арыгіналаў спецыялісты прызнаюць бесперспектыўнымі [4; 14]. Профільныя архівы (Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі) пры прыняцці рашэння аб капіраванні матэрыялаў ГАСА аддавалі перавагу іншым матэрыялам, пераважна — гаспадарча-эканамічнага характару. На цяперашні час дзяржаўныя архівы Беларусі не маюць на сваім захоўванні ніводнага дакумента са складу названага комплекса ні ў форме

арыгіналу, ні і ў форме электроннай копіі. Падаецца, ва ўмовах, калі Беларусь стала незалежнай дзяржавай, у працэсе вяртання нашых архіўных багаццяў прыярытэтная роля павінна адводзіцца дакументальным помнікам-сімвалам беларускай дзяржаўнасці. У лагічнай структуры НАФ перыяду ВКЛ і Рэчы Паспалітай, дзяржаўны архіў ВКЛ і, у прыватнасці, комплекс арыгіналаў актаў несумненна займае цэнтральнае месца. Яго вартасць падкрэсліваецца і тым, што комплекс захоўваўся ў Нясвіжы і непарыўна звязаны з архіўнай і бібліятэчнай спадчынай роду Радзівілаў ардынатаў нясвіжскіх, унесенай у рэестр UNESCO у 2009 г. Найбольш перспектыўным шляхам яго аднаўлення з'яўляецца выраб якасных электронных копій, уключэнне іх у склад НАФ на правах арыгіналаў і атрыманне Рэспублікай Беларусь усіх правоў на іх выкарыстанне.

Вялікае Княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае займае выключна важнае месца ў гісторыі Беларусі другой паловы XIII—канца XVIII стст. Яно з'яўлялася адной з самых магутных і развітых краін Еўропы. Гэта была поліэтнічная і поліканфесійная дзяржава, але ў яе тэрытарыяльнай, этнічай, культурнай аснове знаходзіліся беларускія землі, іх насельніцтва, іх культура і вера. Даны факт робіць ВКЛ не проста неаддзельнай часткай нашай гісторыі — гэта сама наша гісторыя і, што найбольш важна, — частка гісторыі дзяржаўнасці Беларусі. Успрыняцце Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага як неад'емнай часткі гісторыі беларускага народа, адной з форм яго дзяржаўнасці ў названы перыяд, аднаго з ключавых этапаў у гісторыі фарміравання сучаснай незалежнай Беларусі, разуменне яе пераемнасці з ВКЛ — маюць надзвычай важнае значэнне для цяперашняга перыяду развіцця краіны ў цэлым, і для падыходаў да аднаўлення паўнаты культурнай спадчыны беларускага народа, у прыватнасці*. Сцвярджальны і адназначны адказ на такія пытанні — ўмова фарміравання ў народа цэласнага ўспрыняцця сваёй гісторыі і разумення ролі сваёй краіны ў гісторыі Усходняй і Цэнтральнай Еўропы, разумення сябе, умова фарміравання фундаментальных асноў патрыятызму — самапавагі, гонару за прыналежнасць да народа, з якога паходзіш, а значыць высокай адказнасці перад суродзічамі і клопату за будучыню Беларусі. Члены Рады І-га Усебеларускага кангрэса 1917 г., як і дзесяткі, сотні іншых славутых дзеячоў свайго часу адказалі б на пастаўленае пытанне станоўча**. Выдатныя вучоныя-славісты з сусветным імем займалі тую ж пазіцыю. У. І. Пічэта яшчэ ў 1922 г. сфрмуляваў канцэптуальны падыход да распрацоўкі гісторыі самастойнай беларускай дзяржавы, ён сцвярджаў: «Разглядаць гісторыю Беларусі як частку гісторыі Маскоўшчыны, Літвы ці Польшчы — цяпер ужо шкодна. Трэба безадкладна будаваць гісторыю беларускага народу, яго культурнага, эканамічнага і палітычнага жыцьця, яго імкненняў і барацьбы, ацэньваючы факты з пункту гледжання інтарэсаў самаго беларускага народу, а ня тых

* У межах канферэнцыі, якой прысвечаны зборнік, яе ўдзельнікамі адзначаліся факты зваротаў прадстаўнікоў самых розных сацыяльных і прафесійных груп сучаснага грамадства адрасаваных гісторыкам, з наступным зместам: «Вялікае Княтсва Літоўская — гэта наша дзяржава?»

** Рада Першага Ўсебеларускага З'езда час страты незалежнасці адносіла да падзей 1569 г. і Люблінскай уніі: «У часе сусьветнай вайны, што бурыць адны моцные дзержавы і аслабаняе другіе, абудзілася Беларусь да дзяржаунаго жыцця. Пасьля трох с паловаю вякоу і нявoлі ізноу на увесь сьвет кажа беларускі народ аб тым, што ён жыве і будзе жыць». [ІІ-я] Ўстаўная грамата Выканаўчага Камітэту Рады Першага Ўсебеларускага З'езда Мінск, 9 сакавіка 1918 г. [20, с. 52].

ці іншых дзяржаўных арганізацый, якія над беларускім народам у розныя часы панавалі» [цыт. па: 10, с. 201][*].

Кожны народ мае ўласную гісторыю, яна — ўнікальная. Шлях да дасягнення дзяржаўнай незалежнасці ў кожнага народа свой. Кожны этап гэтага шляху — святы. І дасягнуўшы мэты, мы павінны прыкласці ўсе намаганні, каб нават самае дробнае сведчанне гэтага шляху — не страціць, а страціўшы — знайсці і зберагчы, як зберагаюць частку сябе.

**Бібліяграфічны спіс**

1. Государство — это мы: Выступление Президента на торжественном собрании, посвященном Дню Независимости Республики Беларусь, 1 июля 2017 г. // СБ Беларусь сегодня. — № 125. — 4.07.2017 г.

2. Латушкін, А. М. Рэестр дзяржаўнага архіва Вялікага Княства Літоўскага ад 26 лістапада 1623 г. і яго значэнне для рэканструкцыі складу комплекса арыгіналаў актаў кан. XIV — пач. XVII стст. / А. М. Латушкін // Беларускі археаграфічны штогоднік. —2017. — Вып. 18. — СС. 247—264.

3. Рыбакоў, А. Я. Арганізацыя дзяржаўнага архіва Вялікага княства Літоўскага ў канцы XV—XVII ст. / А. Я. Рыбакоў // Архівы і справаводства. — 1999. — № 2. — С. 70—76.

4. Шумейка, М. Ф. Гісторыка-прававыя і маральна-этычныя аспекты рэстытуцыі ў адносінах да беларускіх архіваў / М. Ф. Шумейка // Архівы і справаводства. —2000. —№ 4. — СС. 91—100.

5. Працы Першага з'езда даследчыкаў беларускай археалогіі і археаграфіі, 17—18 студзеня 1926 г. — Мн.: Інбелкульт, 1926. — 86 с.

6. Латушкін, А. М. Дзяржаўныя акты Вялікага княства Літоўскага ў складзе Нясвіжскага архіва князёў Радзівілаў: стан і накірункі даследавання праблемы / А. М. Латушкін // Мінулае і сучаснасць: архівы ў сістэме гуманітарных ведаў. — Мінск: БелНДІДАС, 2010. — С. 31—37.

7. Даўгяла, Дз. І. Літоўская Мэтрыка і яе каштоўнасьць для вывучэньня мінуўшчыны Беларусі / Дз. І. Даўгяла; прадм. К. Б. Езавітава. — Рыга: Беларус. Выд-ва ў Латвіі, 1933. — 14 с.

8. Гернович, Т. Д. Возвращение белорусских документальных ценностей, оказавшихся за пределами Республики Беларусь: опыт и перспективы / Т. Д. Гернович // Беларускі археаграфічны штогоднік. —2017. — Вып. 18. — СС. 150—158.

9. Пичета, В. И. Белоруссия и Литва XV—XVI вв. (исследования по истории социально-экономического, политического и культурного развития) / В. И. Пичета; под ред. З. Ю. Копысского [и др.]. — М.: Изд. АН СССР, 1961. — 812 с.

10. Памяць і слава: Першы рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта — Уладзімір Іванавіч Пічэта / склад.: С. М. Ходзін, М. Ф. Шумейка, А. А. Яноўскі; рэдкал.: С. У. Абламейка (адк. рэд) [і інш.]. — Мінск: БДУ, 2011. — 375 с.

11. Шумейко, М. Ф. Собрать рассеяное / М. Ф. Шумейко. — Минск: БелНИИДАД, 1997. — 153 с.

12. Первая всебелорусская конференция архивных работников 12—15 мая 1924 г. Документы и материалы / Сост. М. Ф. Шумейко. — Мн.: БелНИИДАД, 1999. — 147 с.

13. Доўнар-Запольскі, М. В. Выбранае; уклад., прадм. В. М. Лебедзевай; каментар Валянціны Лебедзевай [і інш.]. — Мінск: Беларуская навука, 2017. — 668 с.

14. Шумейко, М. Ф. Исторические и правовые аспекты реституции белорусских архивов / М. Ф. Шумейко. Минск: БелНИИДАД, 2013. — 269 с.

* Прафесар У. І. Пічэта прызнаваў мэтазгоднасць выкарыстання ў дачыненні да ВКЛ тэрміна «Беларуска-Літоўская дзяржава» [10, с. 204]. Гэту пазіцыю падзялялі выдатныя дзеячы айчыннай гістарычнай навукі першай паловы XX ст. В. Доўнар-Запольскі — «Вялікае Княства Беларуска-Літоўскае», «Беларуская дзяржава»; Дз. І. Даўгяла — «Беларуска-Літоўская дзяржава», «вялікія князі Беларускія і Літоўскія»; В. Д. Дружчыц — «Літоўска-Беларуская дзяржава» [13, с. 439—504, 520; 5].

15. Высоцкая, Н. Ф. О Несвижской коллекции по документам ЦК КПБ 1939—1941 гг. / Н. Ф. Высоцкая, А. Н. Михальченко // Вяртанне-7; БФК [і інш.]; рэдкал.: А. Мальдзіс (гал. рэд.) [і інш.]—Мінск: Бел. фонд культуры, 2002. — С. 99—100.

16. Шумейко, М. Ф. Неудавшаяся попытка интеграции бавшего Виленского исторического архива в Исторический архив Белорусской академии наук (октябрь 1939—1941 г.) / М. Ф. Шумейко // Фундаментальная наука: проблемы изучения, сохранения и реставрации документального наследия. — М.: Архив РАН, 2013 г. — С. 250—260.

17. Ягелявичюс, С. О том, каким образом микрофильмы Литовской Метрики оказались в Литве / С. Ягелявичюс // Новости Литовской Метрики. —№ 3. — 1999. — С. 32—40.

18. НГАБ. — КМФ-18. — Вопіс спраў Літоўскай Метрыкі (архіва канцылярыі Вялікага Князя Літоўскага) XV—XVIII стст. / склад. А. А. Лашкевіч. 1998 г. — 69 с.

19. Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі / Беларускі інстытут навукі й мастацтва [і інш.]; уклад.: Сяргей Шупа (уклад., падрыхтоўка тэксту, камент., пер.). — Вільня, Нью-Ёрк, Менск, Прага, 1998. — Т. 1. — Кн. 1. — 850 [16] с.

**Ларионов Денис Геннадьевич**

*Белорусский государственный университет (Минск, Беларусь)*

## РЕВОЛЮЦИЯ: ЗА И ПРОТИВ. КАТОЛИЧЕСКИЙ ПОДХОД

2017 год является годом нескольких знаковых юбилеев, связанных с крупными историческими событиями: 500-летие начала Реформации, 100-летие завершения революции и гражданской войны в Мексике, 100-летие двух революций в России.

Все эти события имели революционное значение, изменив ход истории не только в непосредственном времени и месте, но и в историческом масштабе. Эти события имели также связь с Католической Церковью. Реформация затронула Церковь самым непосредственным образом, поскольку происходила в ее лоне и имела следствием раскол западного христианства и изменение судьбы Европы и мира. Революция и гражданская война в Мексике затрагивала Церковь несколько иначе: происходила в католической стране, и установившийся впоследствии режим радикально изменил взаимоотношения государства и Церкви. Наконец, Российская революция привела, с одной стороны, к созданию независимых государств двумя католическими народами — поляками и литовцами, однако, в то же время, оказалась одним из самых серьезных в новейшее время вызовов для традиционной христианской духовности и христианского социального идеала.

Следует с самого начала отметить, что отношение Церкви к политическим и социальным революциям начало получать оформление во времени Французской революции конца XVIII в. Среди историков существует мнение, что эта революция определила реакцию папства на большинство новых тенденций современности, вплоть до XX в. [13, p. XXI], более того, само современное папство началось в связи с Французской революцией, поскольку в 1791 г. некоторые территории Папского государства были включены в состав Франции [14, p. 499]. Более того, новая реальность, утвердившаяся в Европе, привела к тому, что Церковь вступила в выраженный конфликт с более либеральным обществом и с современной цивилизацией в целом [12, p. 853].